

# З НОВЫМ, 1999 ГОДАМ, ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Марина ТОМАШ

***

*Когда часы пробьют двенадцать,*
*Год Новый постучится в дверь,*
*Он принесет с собою счастье,*
*Его встречайте поскорей.*
*Мы Вам желаем море счастья,*
*Здоровья, радости, любви,*
*Чтоб не грустили понапрасну,*
*И чтоб сбылись Ваши мечты.*
*Пусть Ваша жизнь течет рекою*
*И волны беды унесут,*
*Желаем быть самим собою,*
*Когда невзгоды вдруг придут.*
*Пусть доброта Вас овевает*
*Своим причудливым теплом,*
*Никто Вам зла не пожелает*
*И беды обойдут Ваш дом.*
*Пусть красота и прелесть мира*
*В Ваших сердцах найдут приют.*
*Будьте нежны, душой красивы,*
*Цените радость всех минут.*
*Пусть позабудется плохое*
*И жизнь Вам радость принесет,*
*И пусть наполнится любовью*
*И счастьем этот Новый год.*

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 19(957) | АЎТОРАК, 29 снежня 1998 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

Ідзе атэстацыя ВНУ

## З ПЕРСПЕКТЫВАЙ НА РОЛЮ ВЯДУЧАГА

Усяго толькі чатыры месяцы застаецца да 30-гадовага юбілею Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны. Пройдзены шлях вядучай вышэйшай навучальнай, навуковай і культурнай установы Беларускага Палесся дазваляе ў поўным аб'ёме вызначыць усе яе здабыткі і перспектывы. Гэта стала справай праверкі і аналізу дзейнасці ГДУ атэстацыйнай камісіі, якая працавала тут пад кіраўніцтвам начальніка аддзела інспекцыі ВНУ Дзяржаўнай інспекцыі навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь кандыдата гістарычных навук В.В.Пупа і яго намесніка, вядучага інспектара названага аддзела Э.Г.Шаўцова.

Атэстацыйная камісія была даволі прадстаўнічай і аўтарытэтнай. У яе склад уваходзіла 170 кіруючых работнікаў ВНУ і акадэмічных навукова-даследчых устаноў, дэканаў, іх намеснікаў, загадчыкаў кафедр, шырока вядомых вучоных, спецыялістаў вытворчасці. Сярод правяраючых былі акадэмікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, прафесары старшыня БелВАКа А.П.Дастанка, дырэктар Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В.Ф.Купрэвіча В.І.Парфёнаў, дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа А.І.Падлужны, старшыня Дзяржкамітэта навукі і тэхналогій прафесар В.А.Гайсёнак, дырэктар Інстытута механікі металапалімерных сістэм, член-карэспандэнт НАН Беларусі Ю.М.Плескачэўскі, рэктар Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.Куляшова прафесар М.А.Аўласевіч, многія іншыя вучоныя з усёй нашай краіны.

Прамежкавыя вынікі атэстацыі універсітэта падведзены на нарадзе старшынь і членаў экспертных камісій з удзелам вучоных, выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ. Нараду адкрыў рэктар член-карэспандэнт НАН Беларусі Л.А.Шамяткоў, а вёў яе старшыня дзяржаўнай атэстацыйнай камісіі В.В.Пупа. Былі заслуханы справаздачы старшынь экспертных камісій па ўсіх напрамках дзейнасці універсітэта. Адзначалася, што па многіх крытэрыях ён дасягнуў высокіх паказчыкаў, мае дзесяць навуковых школ, больш паловы дактароў навук, якія працуюць на Гомельшчыне. Пры універсітэце створаны чатыры спецыялізаваныя саветы па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый.

І яшчэ адзін паказальны факт. Ад вышэйшых навучальных устаноў сістэмы Мінадукацыі на сённяшні дзень трое вучоных з'яўляюцца акадэмікамі і шэсць — членамі-карэспандэнтамі НАН Беларусі, сярод іх — акадэмік і два члены-карэспандэнты прадстаўляюць Гомельскі дзяржаўны універсітэт.

У ходзе атэстацыі універсітэта даваліся кантрольныя работы для студэнтаў трэціх і выпускных курсаў усіх факультэтаў. Атрыманыя адзнакі адпавядаюць устаноўленым параметрам. Найбольш парадавалі будучыя матэматыкі. Выкананыя імі заданні ацэнены добрымі і выдатнымі адзнакамі.

У сваіх вывадах усе экспертныя камісіі зрабілі заключэнне, што Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны адпавядае свайму статусу і яго можна аднесці да разраду класічных. Група экспертаў у сваім хадайніцтве ў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь палічыла магчымым прызнаць ГДУ вядучым у сістэме нацыянальнай вышэйшай школы.

**Б.ВАЛОДЗІН.**



**Незвычайны, своеасаблівы экзамен здавалі напярэдадні навагодніх святаў студэнты ГДУ, якія вывучаюць этыку і праходзяць спецыялізацыю "Арганізацыя і методыка пазакласнай і пазашкольнай работы". Адзнак за яго ў іх залікоўках не ставіцца, а вось у сэрцах дзяцей -- выхаванцаў дзіцячых дамоў, школ-інтэрнатаў, з няпоўных сем'яў, якім яны падрыхтавалі і падарылі святочныя падарункі, застанецца найвялікшая радасць. Экзамен на міласэрнасць на працягу многіх гадоў трымаюць студэнты ГДУ, а разам з імі вучні СШ№44 і абласное аддзяленне Беларускага дзіцячага фонду ў час традыцыйнай рэспубліканскай навагодняй акцыі "Нашы сэрцы -- дзецям".**

**На здымку: на дабрачыннай ёлцы ў ГДУ.** **Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## ДАНІЮ НАВЕДАЛІ ЖУРНАЛІСТЫ

По запрашэнню адукацыйнага цэнтра Даніі і яго фінансаванні гэтую краіну наведала група радыё-тэлежурналістаў і газетчыкаў Гомельшчыны — першая з нашай рэспублікі. Дэлегацыю прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, у якую ўваходзіў і рэдактар газеты "Гомельскі універсітэт", узначальваў намеснік старшыні аблвыканкома В.С.Ахлесцін. Гасцям была прадстаўлена магчымасць грунтоўна азнаёміцца з дзейнасцю рэдакцый буйнейшых газет, выдавецтваў і радыётэлестудый адной з самых развітых краін Заходняй Еўропы. З цікавасцю прайшлі экскурсіі па яе гарадах.

Больш падрабязная публікацыя аб гэтай паездцы будзе змешчана на старонках нашай газеты.

## ДАТА НЕ КРУГЛАЯ, АЛЕ ЗНАМЯНАЛЬНАЯ

У актавай зале Беларускага дзяржаўнага універсітэта транспарту 12 снежня адбыўся ўрачысты сход. Ён быў прысвечаны 45-годдзю адной з вядучых у нашай рэспубліцы вышэйшых навучальных устаноў. Хаця гэтая дата і не круглая, але для калектыву БелДУТа яна знамянальная. За апошнія гады ім дасягнуты значныя поспехі. Былы інстытут транспартнікаў набыў статус універсітэта, тут адкрыты спецыялізаваны Савет па абароне дысертацый, створаны інстытут па павышэнню кваліфікацыі і пера-падрыхтоўцы кадраў галіны, значна ўзрос навуковы патэнцыял.

Сярод шматлікіх віншаванняў у гонар 45-годдзя БелДУТа быў і прывітальны адрас ад калектыву нашага універсітэта.

Тэатралы-юбіляры

## НЕ ЗГАСНУЦЬ ТВОРЧАМУ ГАРЭННЮ



Для творчага калектыву 5 гадоў — узрост, можна сказаць, яшчэ зусім юны. Тым не менш, гэта ўжо і пэўная вяха ў яго гісторыі. Менавіта яе дасягнуў студэнцкі тэатр-студыя "Если бы..." нашага універсітэта.

На свой маленькі юбілей студыйцы на чале са сваім кіраўніком і рэжысёрам Генадзем Варонiным запрасілі прыхільнікаў тэатральнага мастацтва з ліку студэнтаў і выкладчыкаў ГДУ, сваіх калег -- удзельнікаў самадзейных калектываў г.Гомеля.

На ўрачыстасці, якая праходзіла ў актавай зале універсітэта, былі перагорнуты многія старонкі жыцця і творчасці тэатра-студыі — ад яе першых нясмелых крокаў на сцэне і да ўпэўненай заваёвы тэатральнага Алімпа. Усё ўмясцілася ў гэтыя 5 гадоў: і жаданне здзіўляць па-добраму публіку сваім арыгінальным рэпертуарам — жартоўнымі мініяцюрамі, узятымі непасрэдна з жыцця рэжысёра і саміх акцёраў, і здача сур'ёзнага экзамена на тэатральную сталасць. Так, пастаноўка спектакля "Шкірдзюкі займаюць абарону" па п'есе гомельскага драматурга Васіля Ткачова прынесла калектыву ганаровае званне народнага.

Цяпер тэатр-студыя "Если бы..." ужо добра вядомы на Гомельшчыне, у рэспубліцы як дыпламант і лаўрэат I і II Усебеларускага фестывалю народнага гумару ў в.Малыя і Вялікія Аўцюкі Калінкавіцкага раёна, лаўрэат фестывалю народнай творчасці "Беларусь — мая песня", дыпламанты I абласнога фестывалю маладзёжных тэатраў мініяцюр "Рукой падаць", які праходзіў у г.Рагачове, і фестывалю "Студэнцкая вясна" у Віцебску.

Поспехі і ўдачы не закружылі галаву самадзейным акцёрам, яны разумеюць, што толькі карпатлівая праца, пошук могуць гарантаваць далейшае творчае развіццё калектыву. Гэтага ім шчыра жадалі са сцэны і шматлікія госці ў час сваіх віншаванняў.

За беражлівае захоўванне беларускіх народных традыцый, дасягнутае творчае майстэрства, плённую работу па маральна-эстэтычнаму выхаванню моладзі, актыўную канцэртную дзейнасць калектыў тэатра ўзнагароджаны дыпломам, граматамі, каштоўнымі падарункамі абласнога цэнтра народнай творчасці, рэктарата, прафкома студэнтаў ГДУ, калег, сяброў.

Паказам урыўка з новага спектакля, які хутка ўбачаць гледачы, юбіляры запэўнілі: іх творчаму гарэнню ніколі не згаснуць.

**Т.ДУБЯК.**

# ДЫПЛОМЫ АТРЫМАНЫ, ВУЧОБА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

У Франка-Беларускім інстытуце кіравання, які створаны на базе нашага універсітэта ў 1995 г., нядаўна адбылося чарговае ўручэнне яго студэнтам сертыфікатаў дыпломаў. Вучэбны план сумеснай міждзяржаўнай вышэйшай навучальнай установы прадугледжвае трохразовую выдачу іх студэнтам пасля трох, чатырох і пяці гадоў навучання пры ўмове паспяховай здачы імі ўсіх залікаў і экзаменаў. Так робіцца ў Францыі. Дыплом пасля трох гадоў вучобы носіць назву Deug, чатырох — Licence, і поўных, пяці гадоў — Maitrise. Апошні прыраўноўваецца да беларускага дыплома магістра. Уладальнік поўнага такога набору дыпломаў лічыцца ўжо сапраўдным высокакваліфікаваным спецыялістам.

Звычайна ў канцы каляндарнага года кіраўніцтва з французскага боку сумеснай ВНУ, яго выкладчыкі прыязджаюць у ГДУ для падвядзення вынікаў дзейнасці інстытута за мінулы год, акрэслівання далейшых перспектыў работы, правядзення вучэбных заняткаў са студэнтамі.

У чарговы раз ва універсітэт прыехалі віцэ-прэзідэнт прафесіянізаванага інстытута менеджменту і кіравання вытворчасцю ў складзе Аверньскага універсітэта Клермон-Феран-1, садырэктар Франка-Беларускага інстытута кіравання прафесар Морыс Шэневуа, яго намеснікі мадам М.-А. Дзюбост і мадам Р.Кампос, выкладчык Філіп Гітар.

Французскія эксперты па выніках вучобы студэнтаў, іх практыкі і стажыроўкі ў г.Клермон-Феране вызначылі, хто заслужыў права атрымання сертыфікатаў дыпломаў. Варта нагадаць, што ў мінулым годзе адпаведныя дакументы, якія засведчылі аб паспяховым засваенні трохгадовай праграмы навучання, былі ўручаны 13 будучым эканамістам і правазнаўцам. Знамянальна, што ў той урачыстасці прымаў удзел пасол Францыі ў Рэспубліцы Беларусь Бернар Фасье, з рук якога і былі атрыманы дыпломы. Пан пасол адзначыў тады вялікую важнасць



стварэння такога сумеснага інстытута як у плане навучання студэнцкай моладзі, так і пашырэння дзелавога і культурнага партнёрства дзвюх краін — Францыі і Беларусі.

Сёлета сертыфікаты студэнтам выдаў і цёпла павіншаваў з гэтай падзеяй садырэктар Франка-Беларускага інстытута кіравання Морыс Шэневуа. Дыпломы аб паспяховым заканчэнні трох гадоў вучобы ўручаліся цяпер ужо ў другі раз, а чатырох — упершыню. Іх уладальнікамі сталі 13 чалавек.

Дыпломы ўручаны, а вучоба ў Франка-Беларускім інстытуце кіравання працягваецца. Як адзначыў М.Шэневуа, ёсць добры стымул вучыцца паспяхова ў студэнтаў малодшых курсаў.

**Т.ДУБЯК.**

**На здымку: сертыфікат дыплома ўручаецца студэнтцы Франка-Беларускага інстытута кіравання, будучаму эканамісту Вользе Казаковай.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

# БУДУЧЫНЯ – ЗА СУЧАСНЫМІ ТЭХНАЛОГІЯМІ

На базе кафедры "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі" адбылася выстаўка-семінар пад назвай "Сучасныя сеткавыя тэхналогіі". Яна была арганізавана сумесна з навукова-вытворчым прадпрыемствам "Сервер", якое з'яўляецца на сённяшні дзень вядучым сістэмным інтэгратарам у Гомельскай вобласці, пастаўшчыком камп'ютэраў, абсталявання для камп'ютэрных сетак і сістэм сувязі, і з НВП "БелСофт" (г.Мінск). Яно таксама паспяхова ажыццяўляе распаўсюджванне ў рэспубліцы перадавых інфармацыйных, камп'ютэрных і сеткавых тэхналогій.

Сучасная навука і вытворчасць сродкаў для стварэння і эксплуатацыі камп'ютэрных сетак развіваюцца надзвычай хутка. Даўно мінулі тыя часы, калі камп'ютэры эксплуатаваліся асобна адзін ад аднаго. Хутка кожны жыхар нашай планеты будзе мець уласны невялікі пераносны камп'ютэр з магчымасцю падключэння яго да глабальнай агульназямной камп'ютэрнай сеткі.

А пакуль у сённяшніх умовах развіцця нашай рэспублікі прадпрыемствам дастаткова цяжка знаходзіць сродкі для набыцця абсталявання, якое каштуе вельмі дорага. І тым больш прыемна, што на выстаўку-семінар у наш універсітэт сабралася каля 200 чалавек, кіраўнікоў падраздзяленняў розных прадпрыемстваў і арганізацый, якія бачаць перспектыву і гатовы выкарыстоўваць у сваёй рабоце новыя, перадавыя тэхналогіі апрацоўкі інфармацыі.

Кафедру АСАІ і фірму "Сервер" звязваюць цесныя сувязі з 1995 года. За гэты час фірма аказала ёй вялікую падтрымку ва ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы. Створана нямала стэндаў, перададзена абсталяванне, аснашчаны шэраг лабараторый. Наша апошняя сумесная справа – гэта



распрацоўка праекта і далейшае аснашчэнне вылічальнага цэнтра кафедры АСАІ.

Калі гаварыць аб супрацоўніцтве навукова-вытворчай кампаніі і нашай навучальнай установы, то можна сказаць, што яно ўжо мае выдатны прыклад для пераймання.

На выстаўцы працаваў дзейнічаючы стэнд **(на здымку)**, на якім дэманстравалася сучаснае сеткавае абсталяванне, апошнія навінкі (напрыклад, вядзенне дыялогу па камп'ютэрнай сетцы з выкарыстаннем відэакамер і мікрафонаў, лічбавая сумяшчальнасць з камп'ютэрамі апаратуры, якая дазваляе з дапамогай лічбавага фотаапарата атрымліваць адлюстраванне на прынтэры камп'ютэра, і інш.).

На семінары было заслухана шмат цікавых дакладаў, якія з'яўляюцца вельмі актуальнымі. Сярод іх, напрыклад, такія як "Тэндэнцыі развіцця тэхналогій лакальных вылічальных сістэм", "Бяспроваднaя сувязь. Рэальныя магчымасці", "Пабудова сеткі перадачы дадзеных. Інтэграцыя голасу і дадзеных. Рацыянальнае выкарыстанне тэхналогій".

Прыемна ўсведамляць, што нягледзячы на складаную эканамічную сітуацыю, спецыялісты жыва цікавяцца навінкамі камп'ютэрнай тэхнікі і сеткавых тэхналогій. Вельмі важна граматна і добра іх эксплуатаваць.

Праведзеная выстаўка-семінар засведчыла аб узмацненні сувязі навучальнай установы, якая рыхтуе высокакваліфікаваныя кадры, вытворцаў і карыстальнікаў сучасных тэхналогій.

**А.ДЗЕМІДЗЕНКА,**
**загадчык кафедры АСАІ,**
**дацэнт.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

**Канферэнцыі**

# САЦЫЯЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ МОЛАДЗІ



Па такой тэме Федэрацыя прафсаюзаў Беларуская, Міжнародны недзяржаўны інстытут працоўных і сацыяльных адносін (г.Мінск) правялі міжнародную навукова-практычную канферэнцыю. У ёй прынялі ўдзел вучоныя, выкладчыкі, студэнты, аспіранты ВНУ і навукова-даследчых цэнтраў нашай рэспублікі, прадстаўнікі БПСМ, практычныя работнікі прафсаюзных, дзяржаўных арганізацый і ўстаноў Беларусі і замежных краін.

На пленарным пасяджэнні і ў рабочых секцыях удзельнікамі канферэнцыі разгледжаны тэарэтычныя і практычныя аспекты ўздзеяння на моладзь эканамічных, сацыяльных, экалагічных, дэмаграфічных і іншых умоў і фактараў, стан і накіраванасць маладзёжнай палітыкі, якая праводзіцца дзяржаўнымі органамі, прафсаюзамі. Вялася зацікаўленая размова аб арыентацыях моладзі ў розных сферах яе жыццядзейнасці.

На канферэнцыі адзначалася, што меры і дзеянні, якія прымаюцца і ажыццяўляюцца сёння, недастатковыя. Яны не змаглі пераадолець сур'ёзных крызісных з'яў і тэндэнцый у маладзёжным асяроддзі. Працягваюцца незапатрабаванасць стваральнай энергіі і наватарскага патэнцыялу розных катэгорый моладзі, яе сацыяльная і бытавая неўладкаванасць, матэрыяльная незабяспечанасць, беспрацоўе, духоўная спустошанасць. Удзельнікі канферэнцыі падкрэслілі надзвычайную важнасць і неабходнасць узмацнення ўвагі органаў дзяржаўнай улады і кіравання, наймальнікаў, прафсаюзаў да нармалізацыі становішча спраў у маладзёжным асяроддзі, да распрацоўкі і ажыццяўлення комплексу мер па павышэнню ўзроўню сацыяльнай абароны моладзі, перш за ўсё, у рэалізацыі яе канстытуцыйных правоў на жыллё, адукацыю, працу, ахову здароўя і інш.

На канферэнцыі прыняты мемарандум, накіраваны на ўсебаковую абарону правоў моладзі, і ў якім падкрэсліваецца яе вялізны патэнцыял, здольны ўзняць эканоміку, захаваць і развіць інтэлектуальны ўзровень і забяспечыць Рэспубліцы Беларусь дастойнае месца сярод высокаразвітых дзяржаў свету.

Ад нашага універсітэта ў рабоце канферэнцыі прыняла ўдзел і выступіла з дакладам "Роля прафкома студэнтаў у рабоце па адаптацыі першакурснікаў ва ўмовах ВНУ" старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава.

**(Наш кар.)**



*З прыўзнятым настроем сустракае Новы, 1999 год малады даследчык беларускай філалогіі Рыгор Серыкаў. Пад кіраўніцтвам прафесара кафедры беларускай мовы У.В.Анічэнкі ён паспяхова закончыў аспірантуру і ў гэтым месяцы абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.*

***На здымку: Р.Серыкаў у час абароны дысертацыі на спецыялізаваным Савеце пры ГДУ.***

*Фота У.ЧЫСЦІКА.*

# "НІКА" – НАШЫМ ПЕРШАКУРСНІКАМ

На агульнагарадскім фестывалі агляду талентаў першакурснікаў ВНУ Гомеля поспех выпаў на долю студэнтаў нашага універсітэта. Яны занялі агульнае першае месца і ўдастоены галоўнага прыза – "Нікі". Ганаровая ўзнагарода ва ўрачыстай абстаноўцы ўручана першым сакратаром абкома БПСМ Аляксандрам Мацieўскім рэктару ГДУ Л.А.Шамяткову перад папярэднім падвядзеннем вынікаў па атэстацыі універсітэта.

# ТУТ ВУЧЫЎСЯ СКАРЫНА

**(Працяг. Пачатак у №18 за 15 снежня г.г.)**

**З** мэтай атрымаць натхненне, перапыніць на хвіліну напружаны рытм вучобы, Скарына выходзіў у горад і захапляўся багатай і перадавой архітэктурай, дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам і жывапісам у самой акадэміі. Сотні разоў ён любаваўся Вавельскім узгоркам з незвычайна прыгожай і велічнай крэпасцю каралеўскага замка, крапаснымі сценамі самога горада /дасюль захаваўся толькі маленькі ўчастак — круглая вежа Барбакан з байніцамі і Фларыянская брама/, ратушай на цэнтральнай плошчы горада, Мар'янскім касцёлам, вяртаўся зноў у акадэмію паўз драўляную статую заснавальніка ўстановы караля Казіміра Вялікага /выканана ў 1380 г./.

Але вялікі сын беларускага народа меў і моцны галаўны боль. Справа ў тым, што яго радзіма — Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае — вяла цяжкую зацяжную вайну з суседняй магутнай краінай — Рускай дзяржавай. Не суцяшала яго і тое, што княства было ў цесным эканамічным і нават палітычным саюзе з Польшчай. Ён балюча перажываў, што льецца кроў яго землякоў, для якіх ён вучыўся, задумаў выдаваць кнігі, раскрыць вочы на свет і наогул прысвяціць ім усё сваё жыццё. І ў Кракаве ён адчуваў, што жыве ў краіне, якая ваюе, і на навучанне, на ўтрыманне акадэміі выдаткоўваецца менш сродкаў.

У 1501 г. памёр польскі кароль Ян Ольбрахт і на яго месца быў абраны вялікі князь Вялікага княства Літоўскага Аляксандр. Па дамове аб уніі 1501 г. абедзве дзяржавы зліваліся ў адну. Аднак гэты дакумент да пэўнага часу заставаўся толькі на паперы. У 1503 г. ВКЛРЖ было вымушана заключыць з Рускай дзяржавай шасцігадовае перамір'е. Усяго праз тры гады (1506), калі Скарына заканчваў універсітэт, памёр і Аляксандр. Вялікакняжацкі прастол дастаўся на гэты раз Жыгімонту, малодшаму сыну Казіміра IV. Польскія ўплывовыя класы, каб узаконіць унію абедзвюх дзяржаў, выбралі Жыгімонта I і польскім каралём пад імем Зыгмунта (Сігізмунда).

Для больш поўнага ўяўлення феномену Ф.Скарыны вельмі важна пазнаёміцца і з самім універсітэтам, яго гісторыяй. Гэта напоўніць вобраз першадрукара жывымі рысамі ва ўяўленні кожнага, хто цікавіцца яго жыццём і творчасцю.

Ягелонскім універсітэтам першая ВНУ, у якой вучыўся Скарына, пачала называцца толькі з 1817 г. З пачатку ўтварэння да гэтага часу яна называлася Кракаўскай акадэміяй.

У 1362-1363 гг. кароль Польшчы Казімір Вялікі пасылае пасольства да папы Рымскага Урбана V у Авіньён з просьбай санкцыянаваць адкрыццё ў сталіцы дзяржавы Кракаве акадэміі. 23 ліпеня 1363 г. папа даў згоду. 12 мая 1364 г. кароль выдаў загад аб стварэнні ВНУ, а гарадскія органы ўлады выдалі дакумент аб свабодах і прывілеях выкладчыкам акадэміі. 1 верасня 1364 г. папа сваім пісьмом зацвярджае каралеўскі загад. У акадэміі адкрываецца не чатыры факультэты, як у іншых ВНУ Еўропы, а 3 — медыцынскі, юрыдычны і свабодных навук. Самы галоўны і прэстыжны факультэт — тэалагічны — трэба было дзяржаве заслужыць /ён быў адкрыты спецыяльнай булай папы Баніфацыя IV у 1397г./. Акадэмію размясцілі ў каралеўскім замку на Вавелі.

Наступны польскі кароль Людвік Венгерскі не праявіў ніякай цікавасці да акадэміі і каля 1370 г. яна перастала існаваць. Толькі з прыездам у сталіцу новага караля Польшчы, вялікага князя Літоўскага Уладзіслава Ягайлы /па-польску Ягелы, адсюль Ягелонскі/, акадэмія аднавіла сваю дзейнасць. Для гэтага каралеве Ядвізе давялося абіваць парогі рымскага папы ў Авіньёне, перадаць на рахунак акадэміі свой асабісты маёнтак. Калі яна 17 ліпеня 1399 г. памірала, то ахвяравала ВНУ свае самыя дарагія сукенкі,



шмат каштоўнасцей і золата. 22 ліпеня 1400 г. Уладзіслаў Ягайла перадае акадэміі будынак, які існуе да цяперашняга часу — Калегіум Маюс /да XVIII ст. называўся Калегіум Крулеўскага/. У гэтага будынка былі і іншыя назвы, у ім акадэмія размяшчалася да 1887 г., да пераезду ў размешчаны непадалёк Калегіум Новус. Калегіум Маюс у XV ст. істотна павялічаны. Калі тут вучыўся Скарына і да 1519 г. ён набыў сучасны стан. Цяпер тут размешчаны музей універсітэта.

Корпус акадэміі служыў і жыллём для найбольш паважаных прафесараў. На першым паверсе размяшчаліся лекторыі, ці інакш, выкладоўныя залы. Яны насілі назвы старажытных філосафаў і вучоных /Арыстоцеля, Сакрата, Пталемея, Платона, Марона і Галена/. Гэта доўгія, з нізкімі столямі, цемнаватыя і празмерна вільготныя памяшканні, не вельмі прыгодныя для заняткаў.

Адзіным шырокім, высокім і светлым памяшканнем для заняткаў быў лекторый тэалагічны, названы "лекторыем паноў тэолагаў". Яно належала ім да канца XVIII ст.

На першым паверсе знаходзіўся нават карцэр, у якім студэнты адбывалі пакаранне па прысуду рэктара.

Выклады, ці лекцыі, цягнуліся ад світання да вечара не толькі ў лекторыях, але і ў студэнцкіх бурсах (нешта накшталт інтэрнатаў). Суботы прызначаліся для абавязковых дыспутаў. Навучанне вялося палацінску. Да канца XVIII ст. у акадэміі панавала схаластычная методыка навучання. Яна заключалася ў тым, што студэнты павінны педантычна прытрымлівацца навучальнага тэксту, нельга было пераказваць яго сваімі словамі, адвольна. Акрамя перадачы тэксту на памяць, патрэбна было адказваць на шмат дадатковых пытанняў прафесара.

На час вучобы Скарыны ў акадэміі прыпадае першы, найбольшы росквіт установы /усіх іх было тры //1400-1540/.

Да Скарыны ў акадэміі паспеў прайсці навучанне вялікі польскі астраном і матэматык Мікалай Капернік /1491-1495/, вучоны сусветнага ўзроўню, які сваім вучэннем аб геліяцэнтрычнай будове сусвету абвергнуў рэлігійны дагмат аб нерухомай Зямлі як цэнтры свету. У 1492 г. у акадэмічным квартале ўзнік вялікі пажар, у якім згарэў і галоўны корпус — Калегіум Маюс. У час вучобы Скарына, несумненна, удзельнічаў у адбудове акадэміі.

У другой палове XV ст. дасягнула вялікага росквіту акадэмічная школа матэматыкі. Найбольш значнымі прадстаўнікамі яе былі Марцін Бем, аўтар праекта рэформы юльянскага календара, Ян з Глогава (1445—1507), які напісаў вядомыя ўсёй Еўропе матэматычны і астранамічны трактаты, Войцэх з Брудзева /каля 1446-1495/, настаўнік многіх выдатных вучоных, якія потым працавалі ў іншых еўрапейскіх універсітэтах.

Рэктарамі акадэміі ў час навучання Скарыны былі Аміцын з Кракава, Мацвей з Мехава (пад Кракавам) і Бернард з Біскупі. Першы меў вучоную ступень доктара права, другі — доктара медыцыны, трэці быў прафесарам тэалогіі.

**К.УСОВІЧ,**
**загадчык музея-лабараторыі Ф. Скарыны.**

**На здымку: актавая зала ў сучасным галоўным адміністрацыйным корпусе універсітэта.**

**(Заканчэнне будзе).**

# НА СТАРАЖЫТНАЙ ПОЛАЦКАЙ ЗЯМЛІ

**У** г. Полацку прайшла міжнародная навуковая канферэнцыя "Беларускі горад у часе і прасторы: 500 год Полацкай магдэбургіі", на якую былі запрошаны навукоўцы з розных рэгіёнаў блізкага і далёкага замежжа.

Арганізатарамі канферэнцыі выступілі Полацкі дзяржаўны універсітэт, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Полацкі гісторыка – культурны музей–запаведнік. На канферэнцыі працавалі тры секцыі: "Гарадское самакіраванне ў рэтраспекцыі часу", "Сацыяльна–эканамічнае і культурна–духоўнае развіццё беларускага горада", "Археалогія, нумізматыка, этнаграфія, геральдыка сярэдневяковага горада". Такая тэматыка, як, дарэчы, і месца правядзення канферэнцыі, абраны невыпадкова.

Полацкая зямля з'яўляецца калыскай беларускай дзяржавы, адной з крыніц фарміравання нацыянальнай культуры, асветніцтва і навукі. Больш 11 стагоддзяў назад недалёка ад таго месца, дзе Палата, віючыся паміж узгоркамі, аддае свае воды Заходняй Дзвіне, крывічы заснавалі горад і назвалі яго па імені ракі. Так узнік Полацк (Полотеск, Полотьск, Полтеск). Першы раз старажытнейшы горад Беларусі і адзін з самых старых гарадоў усходніх славян узгаданы ў 862 годзе ў "Аповесці мінулых гадоў". Сталіца буйнага еўрапейскага княства, Полацк заставаўся "старшым градам" Полацкай зямлі амаль тысячу гадоў, быў славуты накшталт Кіева і Ноўгарада, а імёны князёў Рагвалода і Усяслава, князёўны Рагнеды і яе сына Ізяслава былі вядомы на ўсёй прасторы імперыі Рурыкавічаў.

Зараджэнне і развіццё беларускай культуры непарыўна звязаны з дзейнасцю Святой Еўфрасінні Полацкай, філосафа, драматурга і паэта Сімяона Полацкага, а таксама ўсходнеславянскага першадрукара Францыска Скарыны, імя якога носіць ГДУ. Менавіта таму асабістае запрашэнне да ўдзелу ў канферэнцыі атрымаў прафесар, доктар філалагічных навук Уладзімір Васільевіч Анічэнка, чый уклад у айчынную Скарыніяну цяжка пераацаніць. На канферэнцыю У.В.Анічэнка прадставіў даклад, прысвечаны полацкім граматам і іх ролі ў гісторыі пісьменнасці Беларусі.

Наш універсітэт на канферэнцыі таксама прадстаўляў загадчык музея – лабараторыі Францыска Скарыны К.Усовіч, які паведаміў аб уплыве магдэбургскага руху на дзейнасць першадрукара. Выступілі з дакладамі і аўтары гэтых радкоў: аб паходжанні і лёсе праваслаўных імёнаў з выданняў Скарыны і аб тым, як мара Скарыны мець кнігі на роднай мове ажыццявілася ў перакладчыцкай дзейнасці Янкі Купалы, які ў 1919–1921 гг. выклаў цудоўнай беларускай мовай "Слова аб палку Ігаравым", геніяльны помнік старажытнай усходнеславянскай літаратуры, некалькі старонак якога прысвечаны старажытнаму Полацкаму княству.

Навукоўцы ГДУ ў сваіх дакладах закранулі цікавыя факты з гісторыі Гомельшчыны. Існаванню Гомеля ў канцы XY ст. прысвяціў сваё выступленне асістэнт кафедры ўсходнеславянскіх народаў В.Галко. Старшы выкладчык кафедры беларускай культуры В.Лебедзева расказала аб гарадской уладзе ў Гомелі ў гады грамадзянскай вайны. Даклад асістэнта кафедры гісторыі Беларусі А. Яшчанкі быў прысвечаны побыту дзяцей у Гомелі ў пачатку XX ст.

Неабходна адзначыць, што канферэнцыя прывабіла да сябе не толькі навукоўцаў з Беларусі і іншых краін СНД, але і даследчыкаў з далёкага замежжа. Цікавасць да нашай мінуўшчыны, да гісторыі беларускай зямлі праявіў у сваім дакладзе "Тыпы сходаў і ўстаноў самакіравання ў Полацку (XII – сярэдзіна XYI ст.)" госць са Швейцарыі Штэфан Родэвальд.

Арганізатары канферэнцыі падрыхтавалі цікавую культурную праграму. Удзельнікі навуковых пасяджэнняў былі запрошаны на экскурсію па Полацкаму гісторыка–культурнаму музеі–запаведніку. Помнікі Полацка не толькі шмат у чым вызначаюць аблічча сучаснага горада, але і надаюць яму непаўторную чароўнасць.

Госці полацкай зямлі наведалі музей беларускага кнігадрукавання, музей–бібліятэку Сімяона Полацкага, выставу–экспазіцыю "Музеі Віцебшчыны", а таксама музей гісторыі і архітэктуры Сафійскага сабора. Менавіта з Сафійскага сабора, пабудаванага па загаду Усяслава–Чарадзея ў сярэдзіне XI ст., пачаўся Полацк архітэктурны, як, дарэчы, пачалася і ўся манументальная архітэктура Беларусі. Узведзены на самым высокім беразе Заходняй Дзвіны, ён увасабляў незалежнасць і моц Полацкага княства. Зараз у Сафійскім саборы цудоўная канцэртная зала, у якой размешчаны вялікі арган. Нам, удзельнікам канферэнцыі, пашчасціла пачуць гукі непаўторнай па сваёй прыгажосці арганнай музыкі, якія, узнікнуўшы пад чарадзейнымі пальцамі вядомай музыканткі лаўрэата міжнароднага конкурсу арганнай музыкі Ксеніі Пагарэлай, узносіліся пад высокія купалы старажытнага храма.

Музыка, што гучыць пад скляпеннямі канцэртнай залы Сафійскага сабора, экспазіцыя музея, разгорнутага тут, усё сённяшняе жыццё гістарычнага помніка, працягваюць высокія традыцыі, пачатак якіх закладзены ў далёкай мінуўшчыне.

Хочацца выказаць ад імя ўсіх удзельнікаў канферэнцыі вялікую падзяку аргкамітэту гэтага навуковага форуму за выдатную арганізацыю, за іх надзвычайную гасціннасць, а таксама пажадаць, каб падобныя сустрэчы навукоўцаў адбываліся і ў далейшым, бо без належнага ведання ўласнай гісторыі няма будучыні.

**Кацярына ХАЗАНАВА,**
**аспірантка кафедры беларускай мовы;**
**Святлана ЧАЙКОВА,**
**асістэнт кафедры псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі.**

## 1999 год -- год кролика



### Смешная мозаика

***

— Зачем на Новый год в домах ставят елки?

— Чтобы наутро по количеству колец на стволе дерева определить, какой сегодня год.

### Жажда любви

Некий шутник достал в декабре полный комплект экипировки Деда Мороза, нарядился в него и, радуясь, что может позабавить свою жену, позвонил у дверей их дома.

Супруга открыла, и не успел он вымолвить и слова, как она бросилась ему на шею, стала целовать и увлекла за собой в спальню. И там, как безумная, предавалась с ним любви.

Наконец, воспользовавшись маленькой передышкой, ему удалось сбросить с себя накладную бороду и усы. И тут он услышал слова жены, которые поразили его на всю жизнь:

- Ну надо же, это ты, Эмиль? А я ведь тебя совсем не узнала...

## Новогодние поверья

По известному поверью, как встретишь Новый год, так весь наступивший год и пройдет: хорошо или не очень, весело или скучно, обильно или скудно. Значит, встречать Новый год надо весело и с толком. А кто умеет делать и то, и другое вместе? Ясное дело, студенты.

Считается плохой приметой входить в новый год со старыми долгами. Лучше с ними рассчитаться. Так и праздновать веселее как должнику, так и кредитору. Что называется, и себе, и людям.

На Новый год можно и погадать. У нас ведь есть заветное желание? Для этого вполне сойдет пасьянс, например, "Часы". Берете колоду карт в 52 листа и раскладываете карты по кругу стопками по четыре штуки в каждой рубашками вверх. Всех этих стопок по кругу должно быть 12 - как чисел на циферблате часов. Одну оставшуюся из четырех карт поместите в середину круга. Это стопка королей. Берете верхнюю карту из этой стопки и открываете ее: если это король, кладете открытой под низ данной стопки и берете следующую сверху, если не король - кладете открытой под соответствующую числовому значению карты стопку на "циферблате" (туз -1; двойка -2;тройка -3 и т.д.; валет — 11, дама — 12), из этой стопки берете верхнюю карту, открываете и кладете под соответствующую стопку и т.д. Процесс пошел! Если все карты по кругу будут открыты, а в центре последним ляжет король — пасьянс сошелся.

Если все четыре короля будут открыты, а по кругу останется хоть одна неоткрытая карта — пасьянс не сошелся и, видимо, желание ваше несбыточно.

Как бы ни сложился пасьянс, Новый год остается с вами. И встречайте его, веселясь от души. Известно, ведь: как встретишь Новый год, так весь год и пройдет...

**К.ЛАПКИН.**

### О проблемах -- с юмором!

*Ах, новые цены да*
*в новом году –*
*Когда же на них мы*
*наденем узду?*
*...Ах, новые брызги да*
*в новом году–*
*От цен на шампанское*
*словно в бреду!*
*Поднимем же рюмки*
*с водичкой на льду–*
*За новое счастье да*
*в новом году!*





## Рождественские гадания

1.Горящую свечку с приговорами и ворожбой привязывают к кирпичу и выбрасывают в окошко. На кого кирпич упадет — тот и суженый /попробуйте повторить 2 раза/.

2.Чтобы увидеть в лунную ночь своего суженого, положите под подушку зеркало, под перину - гребешок, а под одеяло - суженого.

3. Возьмите бутылку водки и в полночь разбейте /хотя нет, это плохой способ/.

4.В полночь поставьте перед собой зеркало, перед зеркалом — свечку, перед свечкой — бутылку водки и проговорите: "Суженый-ряженый, приди-приди, я тебя пельменями накормлю, водкой напою да спать уложу". /Только не очень громко — полдома сбежится/ .

5. В полночь при яркой звезде подожгите дом с четырех углов. Успеют потушить - к обильному урожаю, не успеют — не выйти замуж от трех до пяти с конфискацией.

**Алексей ФЕСЬКОВ**

## Искрой души

*С каким восторгом*
*Прошлый год*
*Мы Новым называли.*
*И вот пришел*
*Его черед*
*Именоваться старым.*
*Но не состарится*
*Вовек*
*Седое пожеланье,*
*Чтоб каждый*
*Добрый человек*
*Нашел свое призванье.*
*Желание добра другим –*
*Уже добро нетленное,*
*Улыбка на ухо тугим,*
*Слова удачи*
*Слабо зрячим,*
*Обнаружение симпатий –*
*Мгновения бесценные.*
*Тогда без тени*
*Сожаленья*
*С мешка достанет*
*Дед Мороз*
*Перо как средство*
*Отчужденья*
*От охвативших мир*
*Угроз,*
*Свечу как символ*
*Озаренья*
*В темнице*
*Многолетних грез.*
*Под звуки*
*Властного баяна*
*Войдем в весельем*
*Сжатый круг,*
*Не пожалеем верных*
*Слов*
*Друг другу*
*В этот вечер,*
*Искрой души*
*Любовь зажжем*
*И праздничные свечи!*

### Мир цветов -- мир прекрасного

## Рождественская звезда



Пуансеттия — так называется молочай красивейший, эуфорбия пульхеррима. Это растение зацветает, когда укорачивается день, как раз в преддверие Рождества, и цветет до марта. Так пуансеттия получила название "рождественская звезда".

В диком виде она растет на влажных тенистых склонах гор в тропической Мексике, Гватемале, Коста-Рике. Это кустарник высотой 1,2 -3 метра. Цветки его мелкие, зеленовато-желтые, собраны в розетки на верхушках побегов. Красоту растению придают прицветные листья, широколанцетовидные ярко-кроваво-красные. Они собраны в пучки под соцветиями, образуя "звезды" диаметром до 30 см. В сумраке тропического леса они привлекают опылителей - крошечных птичек колибри.

Экзотическая красота молочая красивейшего привлекла внимание американского посла в Мексике Джоэля Пуансетта, и он привез его на родину. С 1834 года это растение было введено в культуру. Вскоре его завезли в Европу, где назвали пуансеттией.

Селекционеры создали сорта пуансеттии с компактным кустом высотой до 60 см и окраской прицветных листьев от красной до желтовато-розовой, ярко-алой. Оригинальное растение получило широкое распространение. Пуансеттия легко размножается черенками. В марте срезают верхушки побегов с 5-6 междоузлиями, со среза водой смывают млечный сок, подсушивают и опускают в сосуд с водой, где и происходит образование корней.

Цветущая пуансеттия в горшке — прекрасное украшение жилища, служебного кабинета. Однако нужно учитывать, что как всякая "звезда" она требует соответствующего фона и окружения. Ее хорошо оттеняют аспарагусы, папоротники и другие растения с однотонными листьями.

Из-за выделения млечного сока свежесрезанные побеги рекомендуется прижечь пламенем и лишь потом опускать в воду. Пуансеттию используют для оформления корзин, помещают в высокие и низкие вазы. Кораллово-красные звезды пуансеттии затмевают своей красотой другие цветы, поэтому ее помещают обычно в центре композиции, а в качестве фона используют листья папоротников, тропических растений, окружают цветами гвоздик, калл. Однако красивее всего пуансеттия — в рождественских и новогодних композициях. В окружении веточек сосны или ели, елочных игрушек, свечей рождественская звезда почти три недели сияет своей яркой тропической красотой, создавая праздничное настроение, тепло и уют в доме, напоминая о событиях, в честь которых она названа.

**Р.МАРКЕЛОВА, доцент кафедры ботаники и физиологии растений.**

СПОРТ

## ЧАС АДШЛІФОЎВАЕ СПАРТЫЎНАЕ МАЙСТЭРСТВА

У Мінску прайшлі рэспубліканскія спаборніцтвы па грэка-рымскай барацьбе ў праграме студэнцкай спартакіяды.

Студэнцкая каманда нашага універсітэта заняла трэцяе месца, уступіўшы толькі камандам Акадэміі фізвыхавання і спорту і Гродзенскага універсітэта.

З сярэбранымі ўзнагародамі вярнуліся ў Гомель першакурснік гістарычнага факультэта Сяргей Пасталоўскі і студэнты IV курса факультэта фізічнай культуры Дзмітрый Захарчанка і Генадзь Гром.

Каманду нашага універсітэта рыхтаваў ст. выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту Сяргей Максімавіч Дзегцяроў, якому, дарэчы, у гэтым годзе споўнілася 70 гадоў. Такому трэнерскаму даўгалеццю можна толькі пазайздросціць.

**В.МАРЧАНКА.**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

- гісторыі Беларусі – дацэнта (2);
- беларускай літаратуры – заг. кафедры, дацэнта;
- тэорыі і практыкі англійскай мовы – выкладчыка;
- беларускай культуры – дацэнта;
- радыёфізікі – ст. выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў – не пазней I месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Дэканат, выкладчыкі і студэнты факультэта замежных моў смуткуюць з выпадку смерці студэнта 2-га курса спецыяльнасці "Нямецкая мова" **КАВАЛЁВА Алега** і выказваюць глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Ул.П.БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.

Тыраж 1.000 экз.

Заказ 579.

Падпісана да друку 24.12.1998 г.